*УДК: 821.161*

# АДМЕТНАСЦІ МІФАЛАГІЗМУ Ў ТВОРЧАСЦІ ЯНА БАРШЧЭЎСКАГА І МАКСІМА ГАРЭЦКАГА

**Л. П. Леська**

*Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка,*
*вул. Савецкая, 18, 220030, leska.l.5@yandex.ru*

Навуковая навізна работы заключаецца ў:

– грунтоўным даследаванні міфалагізму ў творчасці Я. Баршчэўскага і М. Гарэцкага як светаадчування, заснаванага на міфалагічных мадэлях і накіраванага на інтэрпрэтацыю міфалагічных схем і вобразаў пры стварэнні нацыянальнага міфа;

– вызначэнні функцыянальнай ролі міфапаэтычнай мадэлі, якая развіваецца ў адпаведнасці з адметнымі міфалагічнымі законамі і светапоглядымі прынцыпамі, выбудоўваецца як своеасаблівы пераход ад узнаўлення эсхаталагічных адчуванняў да касмалагічнага светаўпарадкавання;

– абгрунтаванні міфалагізму ў творчасці Я. Баршчэўскага, М. Гарэцкага як складанай міфапаэтычнай сістэмы, створанай паводле ўстойлівай міфапаэтычнай мадэлі, што выступае сродкам пазнання і спосабам канструявання новай фантастычнай рэальнасці.

***Ключавыя словы***: міфалагізм; міфапаэтыка; міфапаэтычная мадэль; міфатворчасць; касмагонія; эсхаталогія; архетыпы; міфалагемы; гульня.

# THE UNIQUENESS OF MYTHOLOGISM IN THE WORKS OF YAN BORSHCHEVSKY AND MAXIM GORETSKY

**L. P. Lesko**

*Belarusian State Pedagogical University named after Maxim Tank,*
*Sovetskaya St., 18, Minsk, 220050, Belarus, leska.l.5@yandex.ru*

**The scientific novelty and value of the results obtained:**

– a thorough study of mythologism in the works of Y. Borshchevsky and M. Goretsky as a worldview based on mythological models and aimed at interpreting mythological schemes and images when creating a national myth;

– determining the functional role of the mythopoetic model, which is developed in accordance with peculiar mythological laws and worldview principles, it is built as a kind of transition from the reproduction of eschatological sensations to maintaining cosmological world order;

– substantiation of mythologism in the works of Y. Borshchevsky and M. Goretsky as a complex mythopoetic system created on the basis of a stable mythopoetic model, which acts as a means of cognition and a way of constructing a new fantastic reality.

***Key words***: mythologism; mythopoetics; mythopoetic model; myth-making; cosmogony; eschatology; archetypes; mythologems; game.

Даследаванне «Адметнасці міфалагізму ў творчасці Яна Баршчэўскага і Максіма Гарэцкага» абумоўлена ростам цікавасці да міфа і міфалагічнай свядомасці, што тлумачыцца характарам сучаснай эпохі з выразнай «перамогай» навуковай рацыянальнасці і ўзмацненнем крызісных адчуванняў, з пастаянным пошукам апор, выяўленнем вечных каштоўнасцей на фоне катастрафізму свету, разбурэння асноў чалавечага быцця. Важным у XX–XXI ст. стала вывучэнне сутнасці і зместу міфалагічнай свядомасці як фактычна першай па часе ўзнікнення формы грамадскай свядомасці, якая ў канчатковым плане дала чалавеку магчымасць больш дакладна вызначыць сэнс свайго існавання і ўзаемаадносін з соцыумам.

У сучаснай навуцы адсутнічае сістэматызаванае завершанае асэнсаванне міфалагізму, міфатворчасці, аўтарскіх міфаў на матэрыяле мастацкіх тэкстаў Я. Баршчэўскага і М. Гарэцкага.

Персаналіі Я. Баршчэўскага і М. Гарэцкага абраны свядома і невыпадкова для асэнсавання адметнасцей міфалагізму. Падставай для мэтазгоднага вывучэння творчай спадчыны мастакоў слова сталі літаратуразнаўчыя набыткі нашых папярэднікаў (В. Бароўкі, А. Лойкі, М. Мушынскага, З. Тычыны, В. Уткевіч, А. Ярмоленкі), у якіх раскрываюцца аспекты тэматычна-вобразнай блізкасці, кантактна-генетычнай еднасці пісьменнікаў.

Пісьменнікі жылі і працавалі ў багаты на падзеі перыяд XIX – пачатку XX ст.[4]. Яны – сведкі гістарычных катаклізмаў – звярнуліся да архаічнай мінуўшчыны, стварылі новую мастацкую рэальнасць, нацыянальны міф. Важнасць асэнсавання яго ўзрастае ў сувязі з актуалізацыяй праблем нацыяахоўнай функцыі літаратуры [1; 2; 3], пытанняў захавання нацыянальнага коду і нацыянальнай ідэнтычнасці.

Вывучэнне адметнасцей міфалагізму ў творах Я. Баршчэўскага і М. Гарэцкага дасць магчымасць паглядзець на беларускую літаратуру XIX–XX ст. як на цэласны працэс у сінхранічным і дыяхранічным зрэзе.

Універсальным ключом для раскрыцця адметнасці міфалагізму ў творах Я. Баршчэўскага з’яўляецца міфапаэтычная мадэль, якая мае семантычныя, светапоглядныя характарыстыкі і арыентавана на ўзнаўленне цэласнасці быцця. Асноўнымі складнікамі міфапаэтычнага мыслення

[4] Паражэнне паўстання 1830 года, час жорсткіх рэпрэсій, ускладненне грамадска-культурнага жыцця і духоўных пошукаў беларусаў і, як вынік, узрастанне іх нацыянальнай самасвядомасці. Пачатак XX ст. пазначаны як час шырокага распаўсюджання ў навуковым асяродку розных эсхаталагічных канцэпцый гісторыі, у літаратуры, культуры, у самім грамадстве – бязмежна катастрафічных настрояў.

Я. Баршчэўскага сталі архетыпы «культурны герой», «рай» і міфалагемы «госць», «гаспадар», «музы́ка», «дзіця», «сірата».

Адметным спосабам выражэння міфапаэтычнага светабачання ў міфалагізме Я. Баршчэўскага выступаюць формы гульні (дэманічная гульня, фрагменты тэатральнай гульні); мадыфікацыяй архетыпа «культурны герой» у творах пісьменніка з'яўляюцца вобразы гаспадара і музы́кі, задача якіх – упарадкаваць свет, грамадскі і ўласны. Дамінантным кампанентам аўтарскай касмагоніі М. Гарэцкага выступае Хаос, абумоўлены складаным перыядам мяжы XIX–XX стст. – часамі ваеннага ліхалецця, сацыяльных катаклізмаў, духоўнага крызісу асобы. Хаос мае рознае вобразнае выяўленне: у якасці першаматэрыялу ён атаясамліваецца з прасторавым вобразам прорвы, бяздоння, у часавым вымярэнні супадае з момантам «першапачатку» (апавяданні «У лазні», «Роднае карэнне»), з таямніцамі мастацкай творчасці (апавяданне «Зіма»), са сном як «сугестыўным пачаткам» (аповесць «Ціхая плынь»). Міфапаэтычная мадэль у мастацкіх тэкстах М. Гарэцкага ўключае ў сябе пераход ад усеагульнай эсхаталогіі да індывідуальнай як рэакцыі на ўзрастанне катастрафізму быцця.

Формай выяўлення эсхаталагічнага светаадчування ў творах М. Гарэцкага выступаюць вобразы антыхрыста, багаборцаў, іканаборцаў, матыў «арэчаўлення» чалавека. Вызначальнымі элементамі міфалогіі прадметнага свету ў творах класіка беларускай літаратуры сталі працэсы «распрадмечвання» і «апрадмечвання», «арэчаўлення», у аснову якіх пакладзена трансфармацыя архаічнага міфа і рэпрэзентацыя новага аўтарскага міфа.

**Бібліяграфічныя спасылкі**

1. *Мельнікава А. М.* Нацыянальна-светапоглядныя каардынаты беларускай літаратуры першай трэці XX стагоддзя / М-ва адукацыі Рэспублікі Беларусь ; Гомельскі дзярж. ун-т імя Ф. Скарыны. Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2016.

2. *Мельнікава З. П.* Беларуская літаратура і нацыякультурная прастора : манаграфія / Брэсц. дзярж. ун-т імя А. С. Пушкіна. Брэст : БрДУ, 2014.

3. *Максімовіч В. А.* Нацыянальны космас класікі: дыялог традыцый і наватарства ў творчасці Янкі Купалы і Якуба Коласа. Мінск, 2008.